А.В.КАСІМАВА

# СУПРАЦОЎНІЦТВА БЕЛАРУСІ З КРАІНАМІ ЕЎРОПЫ Ў ГАЛІНЕ ВЫСТАВАЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ (1985–1991)

*Палітыка перабудовы, якая пачалася ў 1985 г., змяніла не толькі эканамічны і палітычны лад жыцця нашай краіны, але і прывяла да пэўнага рэфармавання культурнага супрацоўніцтва Беларусі з іншымі краінамі ў галіне выставачнай дзейнасці музеяў. Асноўнымі формамі супрацоўніцтва сталі Дні культуры БССР у сацыялістычных краінах: Балгарыі, Славакіі, Славеніі, Польшчы і інш. Актыўную працу па развіцці міжнародных музейных стасункаў праводзілі Дзяржаўны мастацкі музей БССР і Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі. Аднак ідэалагічнае кіраванне і эканамічныя працэсы не дазволілі БССР стала замацавацца на міжнароднай культурнай арэне. Таму культура нашай краіны ўспрымалася ў свеце не як культура самабытнага народа Еўропы, а як поспехі асобных мастакоў СССР.*

У станаўленні і развіцці культурных адносін паміж дзяржавамі значную ролю адыгрываюць музеі, бо яны з'яўляюцца візітоўкамі любой краіны. Трэба адзначыць, што Беларусь да пачатку 1990-х гг. не мела самастойнага вопыту ў развіцці міжнародных музейных стасункаў, тым не менш у разглядаемы перыяд адбылося шмат цікавых выставачных праектаў як на тэрыторыі краіны, так і за яе межамі. У прапануемым артыкуле разгледжаны шляхі міжнароднага музейнага супрацоўніцтва Беларусі ў апошнія гады існавання СССР.

Праблема музейных узаемасувязей Беларусі з краінамі Еўропы не з'яўлялася дагэтуль аб'ектам самастойных даследаванняў, і таму музейныя стасункі разглядаліся эпізадычна ў абагульняючых працах па культуры Беларусі. Значная колькасць інфармацыі аб музейных праектах змяшчаецца ў матэрыялах перыядычнага друку і архіўных матэрыялах. У рамках даследуемай тэмы вялікую пазнавальную каштоўнасць маюць працы В.Шадурскага [5; 6], аднак у іх праблемы музейнага супрацоўніцтва Беларусі з краінамі Еўропы разглядаюцца толькі ў рамках мастацкіх абменаў. Шэраг цікавых звестак змяшчаюць Паведамленні Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь [4], а таксама архівы Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі [1] і Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі [3].

Міжнароднае культурнае супрацоўніцтва Беларусі ў галіне выставачнай дзейнасці ў другой палове 80 – пачатку 90-х гг. мела пэўную спецыфіку. Дадзеная акалічнасць тлумачылася ў значнай ступені распачатым у Савецкім Саюзе рэфармаваннем, якое мела разнастайныя наступствы як унутры краіны, так і за яе межамі. У красавіку 1985 г. пленум ЦК КПСС, прааналізаваўшы становішча спраў у краіне, прыняў курс на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця. Яго меркавалася ажыццявіць за кошт навукова-тэхнічнага прагрэсу, у першую чаргу за кошт развіцця машынабудаўнічага комплексу, структурнай перабудовы эканомікі, актывізацыі чалавечага фактара і павышэння творчай стваральнай актыўнасці людзей.

Палітыка перабудовы, галоснасць і дэмакратызацыя аказалі моцнае ўздзеянне на культурнае жыццё грамадства. З аднаго боку, палітычны патранат і ідэалагічныя забароны адышлі ў мінулае; галоснасць і плюралізм вярнулі народу шмат культурных каштоўнасцей, адкрылі шляхі да твораў раней невядомых аўтараў, рознабаковай культуры іншых дзяржаў. З'явілася магчымасць больш свабоднага развіцця мастацкай творчасці, вяртання да нацыянальных вытокаў, асэнсавання ўласнай гісторыі. З другога боку, з'явіліся адмоўныя рысы ў культурным жыцці. Рэзкае зніжэнне ўзроўню жыцця пацягнула за сабой камерцыялізацыю культуры, тым больш, што ў складаным эканамічным становішчы разлічваць на падрымку з боку дзяржавы дзеячам культуры не даводзілася. Пазбаўленыя дастатковай фінансавай падтрымкі, у вельмі цяжкім становішчы апынуліся навуковыя, асветныя і культурныя ўстановы. Грамадства жыло, "каб толькі выжыць", у людзей з'явіліся пачуцці песімізму, няўпэўненасці ў будучыні.

Асэнсоўваючы неабходнасць рэфармавання савецкага грамадства, урад СССР пачаў палітыку перабудовы, якую прадугледжвалася праводзіць у рамках сацыяльнага выбару і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культурных каштоўнасцей пад лозунгам “Больш дэмакратыі, больш сацыялізму”. Мелася на ўвазе пераўтварэнне савецкай мадэлі сацыялізму у мадэль дэмакратыі заходняга тыпу. У гэтым сэнсе перабудова была падтрымана большасцю народа. Аднак адсутнасць заканадаўчай базы і прадуманасці большасці прымаемых рашэнняў прывялі да таго, што курс перабудовы, нягледзячы на відавочную абгрунтаванасць і “рэвалюцыйнасць”, у выніку не змог стаць эфектыўнай праграмай змянення грамадства, вырашэння яго праблем і супярэчнасцей. У партыйных дакументах гэтага перыяду адзначаўся слабы ўзровень дзейнасці партыйных органаў у сферы культуры, прызнавалася, што "некаторыя партыйныя, савецкія і камсамольскія працоўныя не маюць дастатковых ведаў па пытаннях літаратуры і мастацтва ўвогуле і нацыянальнай культуры ў прыватнасці, рэдка бываюць на выставах" [6, с. 68].

Праблемам культуры была прысвечана нарада з прадстаўнікамі творчай інтэлігенцыі, якая адбылася ў ЦК КПСС 11 чэрвеня 1987 г. На ёй сфармуляваны падыходы да развіцця нацыянальнай культуры і мовы, культурнай палітыкі ў цэлым. Разам з тым на нарадзе прагучала сур’ёзная крытыка сістэмы выхавання, адзначаны нізкі ўзровень мастацкай свядомасці насельніцтва краіны. Удзельнікі нарады выказаліся за павелічэнне фінансавання культурнай сферы. Аднак ні гэта, ні наступныя партыйныя мерапрыемствы не змаглі аказаць прыметнага ўплыву на сітуацыю ў беларускім грамадстве.

Усё большае значэнне набывалі грамадскія арганізацыі і рухі, у тым ліку апазіцыйныя, якія дзейнічалі ў культурнай сферы і ставілі сваёй задачай як папулярызацыю беларускай культуры, так і развіццё міжнароднага культурнага супрацоўніцтва, пашыралася практыка паездак савецкіх грамадзян за мяжу, наладжваліся асабістыя кантакты. Больш таго, на вышэйшым узроўні ў СССР было абвешчана аб неабходнасці знішчэння “вобраза ворага” ў асобе заходніх краін, аб правядзенні палітыкі адкрытасці, раззбраення і пошуку агульначалавечых каштоўнасцей.

Важная роля ў развіцці замежных сувязей у даследуемы перыяд належала такой дзяржаўнай арганізацыі, як Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі (БелТД), што было ўтворана яшчэ ў красавіку 1926 г. У 1986 г. у структуры БелТД дзейнічалі 373 рэспубліканскія, абласныя, гарадскія і раённыя ўстановы дружбы СССР з сацыялістычнымі краінамі [3, с. 1]. Падтрымліваючы сувязі з больш чым 400 арганізацыямі ў 80 краінах свету, яно рэгулярна праводзіла месячнікі і тыдні дружбы, дні культуры, літаратуры, навукі і тэхнікі, фотавыстаўкі і мастацкія выстаўкі і многія іншыя масавыя мерапрыемствы. Усё гэта спрыяла таму, што ў дзейнасці БелТД вызначыліся станоўчыя тэндэнцыі для развіцця сяброўскіх і культурных кантактаў з грамадскасцю і арганізацыямі краін Еўропы.

БелТД з’яўлялася актыўным арганізатарам такіх комплексных мерапрыемстваў, як дні (тыдні) культуры. Яркім прыкладам гэтага з’яўляюцца Дні Славеніі, праведзеныя ў рэспубліцы ў снежні 1985 г. У рамках Дзён прайшлі выстаўкі партызанскай графікі, плаката, дзіцячага малюнка і вырабаў народных майстроў. На гледачоў вялікае ўражанне аказалі працы з серыі “Славенская партызанская графіка і малюнак”, прадстаўленыя такімі імёнамі, як Ф.Міхеліч, Б.Якац, М.Пірнат і інш. [2]. Аднак творы пералічаных мастакоў не далі беларускаму гледачу поўнага ўяўлення аб стане жывапісу і скульптуры ў гэтай краіне, бо ва ўмовах ідэалагічнага застою 80-х гг. афіцыйныя ўлады ігнаравалі новыя кірункі ў выяўленчым мастацтве. Імёны мастакоў, якія працавалі ў стылі “авангард”, не былі прадстаўлены на выставе, бо яны аказаліся ідэйна чужымі сацыялістычнаму мастацтву. Наступным крокам развіцця двухбаковых адносін сталі Дні БССР, якія прайшлі ў Славеніі ў кастрычніку 1986 г. [2].

У чэрвені 1987 г. у БССР былі праведзены Дні культуры іспанскай вобласці Валенсія. Праграма Дзён уключала правядзенне выставак сучаснага жывапісу, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, фатаграфіі і кніг [3, с. 8]. У перыяд з 1986 г. па 1991 г. Дні

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуры Беларусі прайшлі ў 19 краінах свету, у тым ліку ў Швейцарыі, Нарвегіі, Балгарыі і інш. [3, с. 14].

Значная роля ў развіцці міжнародных культурных адносін належала мастацкім выставам, якія давалі магчымасць пазнаёміцца з творчасцю беларускіх мастакоў прыхільнікам выяўленчага мастацтва за мяжой. Выдатныя водгукі атрымала сумесная выстаўка беларускіх і нямецкіх мастакоў “Вайна наносіць раны кожнаму ў самае сэрца”, якая дэманстравалася ў студзені 1985 г. у галерэі раёна Райнікендорф (Заходні Берлін). На ёй былі прадстаўлены 160 прац 34 беларускіх і 43 нямецкіх мастакоў [3, с. 7].

Выстаўка твораў беларускіх мастакоў з’яўлялася неад’емнай часткай праграмы Дзён Беларусі за мяжой. Так, падчас Дзён беларускай культуры ў Ісландыі (лістапад 1987 г.) жыхары гэтай краіны атрымалі магчымасць пазнаёміцца з працамі вядомых мастакоў Беларусі: Г.Паплаўскага, А.Кашкурэвіча, У.Басалыгі, Л.Марчанкі і інш. [3, с. 9].

Летам 1988 г. у Палацы мастацтваў дэманстравалася выстаўка работ мастачкі з Заходняга Берліна М. Зівекінг “Як ты лічыш, ці жадаюць рускія вайны?”, якая мела антываенную накіраванасць. Цікавасць у крытыкаў і шырокай грамадскасці выклікала выстаўка югаслаўскага мастака-фантасмагора Міліча (Станкавіча), што адбылася вясной 1989 г. у Дзяржаўным мастацкім музеі БССР [5, с. 196].

У ліпені 1989 г. у Мінску прайшлі выстаўкі прац мастакоў горада Радома “Сучасны польскі партрэт. 1944–1988 гг.”, “Партызанскі рух у Славакіі”. У кастрычніку 1989 г. адбылася выстаўка прац ніжнесаксонскіх мастакоў (ФРГ) і твораў з Патсдама (ГДР). У чэрвені 1990 г. мінчане і госці сталіцы маглі пазнаёміцца з выстаўкай “Скульптура ФРГ (1949–1988 гг.)” з горада Дуйсбурга, на якой можна было набыць каталог прадстаўленых твораў з іх мастацтвазнаўчым аналізам [3, с. 12].

Яркай падзеяй культурнага жыцця сталіцы стала выстаўка “Сучасны жывапіс маладых мастакоў Люксембурга”, якая дэманстравалася ў Дзяржаўным мастацкім музеі (ДММ) БССР у пачатку 1991 г. На ёй была прадстаўлена творчасць трох мастакоў гэтай невялікай еўрапейскай краіны [3, с. 13].

Працы замежных мастакоў выстаўляліся не толькі ў сталіцы, але і ў абласных цэнтрах. Так, значнай падзеяй мастацкага жыцця Магілёва з’явілася выстаўка твораў вядомага польскага мастака-кераміста А.Бісагі, якая была арганізавана ў жніўні 1988 г. у Магілёўскай карціннай галерэі ў рамках супрацоўніцтва Магілёва і польскага горада Влоцлавека. У рамках Дзён ПНР у СССР у Гродне ў красавіку 1989 г. экспанаваліся творы народных майстроў Беластоцкага ваяводства, жывапіс польскіх мастакоў пад агульнай назвай “Рэалізм” [3, с. 10].

Неабходна згадаць таксама і пра шэраг абменных выставак. Яны асабліва часта наладжваліся паміж Украінай і Беларуссю. Напрыклад, у 1987 г. у Брэсце экспанавалася выстаўка аднаго з буйнейшых мастакоў Украіны А.Байдунова. У Гомелі ў 1991 г. былі наладжаны выставы твораў вядомых чарнігаўскіх мастакоў М.Ткачова і А.Патапенкі [3, с. 9].

Да даследуемага перыяду адносіцца першы вопыт правядзення ў рэспубліцы міжнародных пленэраў. Гэта форма давала мастакам магчымасць устанавіць кантакты паміж рознымі школамі і кірункамі. Значным прыкладам папулярызацыі культурнай спадчыны Беларусі за мяжой сталі мерапрыемствы, прысвечаныя 500-годдзю з дня нараджэння беларускага асветніка, гуманіста, пісьменніка эпохі Адраджэння Ф.Скарыны. У штаб-кватэры ЮНЕСКА ў Парыжы 14 лістапада 1990 г. працавалі выстаўкі графікі і фотаздымкаў, а таксама выстаўка народных рамёстваў [5, с.197].

Актыўную працу па пашырэнні міжнародных музейных сувязей у разглядаемы перыяд вёў тагачасны Дзяржаўны мастацкі музей БССР, які належаў да найбольш значных музеяў гэтага профілю ў СССР. Яго калекцыі на 1 студзеня 1989 г. налічвалі 22 315 адзінак захоўвання і саступалі толькі зборам вядучых мастацкіх музеяў Масквы і Ленінграда. Па свайму складу калекцыі музея ўяўлялі значную гісторыка-культурную каштоўнасць [1]. Аб плённай міжнароднай дзейнасці музея сведчаць разнастайныя кантакты, якія ён усталяваў з буйнымі музеямі Еўропы. Вынікам гэтага стала вялікая колькасць цікавых замежных выставак з розных краін далёкага і блізкага замежжа. Яны былі не толькі значнымі падзеямі ў культурным жыцці БССР, але і стварылі магчымасць для экспанавання твораў з нашых музеяў за мяжой.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Плённае супрацоўніцтва было ў мастацкага музея з Дзяржаўным Эрмітажам. Напрыклад, у сакавіку 1985 г. у музеі экспанавалася тэматычная выстаўка "Заходнееўрапейская гравюра XV – XVIII стагоддзяў", а летам 1986 г. дэманстравалася выстава "Тыбецкае мастацтва XIII – XIX стагоддзяў" з фондаў Эрмітажа. У сакавіку – красавіку 1989 г. адбылася яшчэ адна выстаўка з калекцый Эрмітажа – "Заходнееўрапейскае прыкладное мастацтва XI – XIX стагоддзяў". На ёй былі прадстаўлены вырабы са срэбра і бронзы ў стылях Адраджэння і барока, кераміка XVI ст. Бернара Палісі, тканіны і карункі, мастацкае шкло (дэкаратыўныя вазы Эміле Гале і братоў Даўм), ювелірныя вырабы, камеі, інталіі, шпалеры [4, с. 93].

Актыўна супрацоўнічаў Дзяржаўны мастацкі музей БССР і з краінамі Прыбалтыкі. З сакавіка па май 1985 г. у Мінску працавала выстаўка "Латышскі габелен", прадстаўленая аб'яднаннем мастацкіх музеяў Латвійскай СССР. У верасні 1986 г. з фондаў Дзяржаўнага мастацага музея Эстонскай ССР у рамках Дзён культуры Эстоніі ў БССР экспанавалася выстаўка "Выяўленчае мастацтва Эстоніі 1920–1930-х гг.". Адначасова ў музеі працавала выстаўка "Літоўская народная драўляная скульптура" з калекцыі Каўнаскага дзяржаўнага музея імя Чурлёніса. У кастрычніку гэтага ж года музей этнаграфіі Эстонскай ССР горада Тарту падчас Дзён культуры Эстоніі ў БССР прадставіў выстаўку "Эстонскае народнае мастацтва" [4, с. 79].

Унікальным музейным праектам другой паловы 80-х гг., які дэманстраваўся ў сталіцы БССР, можна лічыць выстаўку "Чэшскі дызайн і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Чэхаславакіі" (26.10. – 20.01.1987). Гэта выстаўка, нягледзячы на невялікія памеры, давала ўяўленне аб асноўных напрамках развіцця і аб існуючым на той час узроўні чэшскага прыкладнога мастацтва і часткова дызайну. На ёй можна было ўбачыць керамічныя, шкляныя вырабы, а таксама габелены [4, с. 82].

Даволі працяглы час (20.11.1990 – 09.01.1991) у Дзяржаўным мастацкім музеі БССР экспанавалася выстаўка "Мастацкія тканіны XVIII – XIX стагоддзяў" з Дзяржаўнага збору мастацтва на Вавелі ў Кракаве. Выстаўка была арганізавана ў рамках супрацоўніцтва паміж Дзяржаўным зборам мастацтва на Вавелі і Дзяржаўным мастацкім музеем БССР. Супрацоўніцтва прадугледжвала абмен вучонымі, сумеснае правядзенне выставак, сімпозіумаў, што павінна было садзейнічаць пашырэнню двухбаковых культурных сувязей паміж дзвюма краінамі. Усе прадстаўленыя экспанаты былі ў свой час створаны на паўночна-ўсходніх землях Рэчы Паспалітай. У тых месцах знаходзіліся буйныя цэнтры народных рамёстваў, у якіх выраблялі не толькі тканіны, але і прадметы са шкла. На выстаўцы былі прадстаўлены тканыя габелены, паясы, дываны з гербамі магнацкіх родаў Беларусі [4, с. 112].

У кастрычніку–лістападзе 1991 г. у ДММ БССР адбылася выстаўка "Генры Мур. Гравюры, літаграфіі. 1949–1984". Яна была арганізавана Брытанскім Саветам Вялікабрытаніі і складалася з 80 эстампаў, выбраных з 700 прац Г.Мура. Падбіраліся творы такім чынам, каб прадэманстраваць усе віды графічнай тэхнікі, якія аўтар выкарыстоўваў: гравюра, афорт, літаграфія, калаграфія [4, с. 114].

Значнай была і выставачная дзейнасць Дзяржаўнага мастацкага музея па-за межамі нашай краіны. Поспехам карысталася выстаўка "Заходнееўрапейскі жывапіс і культура XVII – XIX стагоддзяў" з фондаў ДММ БССР, якая дэманстравалася ў Адэсе ў красавіку – чэрвені 1986 г. На ёй былі прадстаўлены 48 разнастайных па тэмах, жанрах, манеры выканання мастацкіх твораў мастакоў Англіі, Венгрыі, Галандыі, Польшчы, Францыі і іншых краін, якія дапаўнялі ўяўленні гледачоў аб мастацтве той ці іншай эпохі [4, с. 74].

Этнаграфічнай па змесце з'яўлялася выстаўка народнага мастацтва Беларусі ў Кохтла-Ярве ў рамках Дзён культуры БССР у Эстонскай ССР (05.05. – 18.06.1986). Шырока былі прадстаўлены жаночыя народныя касцюмы XIX – пачатку XX ст. з розных абласцей Беларусі: буркі, наміткі, спадніцы, ручнікі, посцілкі з Неглюбкі, Маларыты, Мотыля, Слуцка, а таксама плеценыя вырабы з лазы і саломы [4, с. 76].

Цікавая праграма была прадстаўлена мастацкім музеем падчас Дзён культуры БССР у Мурманскай вобласці са снежня 1986 г. па студзень 1987 г. Гледачы выстаўкі змаглі ўбачыць творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларусі, а таксама графіку [4, с. 77].

З 8 лістапада па 7 снежня 1987 г. у Гановеры праводзілася выстаўка "Выяўленчае мастацтва Савецкай Беларусі". На ёй былі прадстаўлены 23 творы жывапісу 17 мастакоў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(М.Савіцкі, Л.Шчамялёў, В.Цвірко, М.Грамыка) і 10 габеленаў 5 майстроў. Выстаўка размяшчалася ў выставачнай зале "Кубус". Акрамя гэтага, 67 мастацкіх твораў экспанаваліся ў залах гарадскіх ашчадных кас [1]. Адкрыццё выстаўкі было прымеркавана да пачатку Дзён культуры БССР у Ніжняй Саксоніі. Спецыяльна да гэтага свята нямецкі бок выдаў ілюстраваны каталог выстаўкі з артыкулам пра мастацтва БССР.

Восенню 1988 г. у іспанскім горадзе Сарагоса прайшла выстаўка твораў старажытнага беларускага і сучаснага жывапісу, беларускага народнага ткацтва і саломапляцення. Дэманстраваліся іканапісныя работы беларускіх мастакоў XVII – XVIII стст., партрэты беларускіх магнатаў і шляхты невядомых аўтараў, сучасныя творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва [4, с. 80].

Нягледзячы на значную цікавасць насельніцтва БССР да замежнага выяўленчага мастацтва, не ўсе выстаўкі карысталіся аднолькавым поспехам. Гэта асабліва тычыцца тых выставак, на якіх з творчасцю былі прадстаўлены творы мастакоў іншых краін, мала вядомых нават спецыялістам. Сур'ёзныя тэхнічныя недахопы, што меліся ў правядзенні выставак і пленэраў, зніжалі ўзровень цікавасці замежных прадстаўнікоў да ўдзелу ў гэтых мерапрыемствах. Вялікія цяжкасці існавалі і ў вырабе высокаякасных каталогаў мастацкіх выставак.

Для працэсаў, якія адбываліся ў нашай краіне ў другой палове 80 – пачатку 90-х гг., характэрна хуткая эвалюцыя культурнай палітыкі. Яна яскрава прасочвалася ў фарміраванні новых уяўленняў аб ролі культуры ў беларускім грамадстве, яе мэтах і задачах, развіцці новых напрамкаў і формаў міжнароднага культурнага супрацоўніцтва, а таксама ў пашырэнні геаграфіі замежных сувязей. Трансфармацыя культурнай палітыкі адбывалася ў атмасферы змены ідэалагічных прыярытэтаў унутры краіны і па-за яе межамі, а таксама скрытых і яўных канфліктаў у савецкім грамадстве. У даследуемы перыяд беларускія ўстановы культуры прайшлі шлях ад жорсткай уключанасці ў партыйна-ідэалагічны заказ да фактычна незалежнай дзейнасці.

Такім чынам, у 1985–1991 гг. з уступленнем Савецкага Саюза і былых краін сацыялізму ў Еўропе ў завяршальны этап крызісу адміністрацыйна-каманднай сістэмы змяніліся кірункі замежных сувязей Беларусі ў галіне выставачнай дзейнасці. Радыкальныя змены на сусветнай палітычнай карце сталі вынікам шматгадовага спаборніцтва дзвюх грамадска-эканамічных сістэм, якія абаранялі свае мадэлі ў палітыцы, эканоміцы, ідэалогіі і культуры. Сістэмны крызіс, што прывёў да распаду СССР і Варшаўскага блока, закрануў усе сферы беларускага грамадства, у тым ліку і культуру.

Што тычыцца ўзроўню міжнародных культурных сувязей Беларусі ў галіне музейнай справы ў другой палове 80-х гг., трэба адзначыць, што музеі, як і іншыя ўстановы ў сферы культуры, адчулі на сабе моцны ўплыў палітыка-эканамічных працэсаў, якія адбываліся ў гэты час у краіне. За непрацяглы гістарычны перыяд была знішчана манаполія партыйна-дзяржаўнага апарату, што кантраляваў усе сферы жыццядзейнасці грамадства, у тым ліку і культуру. Дэмакратычныя працэсы садзейнічалі пашырэнню міжнароднага супрацоўніцтва, развіццю яго формаў. Разам з тым аналіз міжнародных сувязей Беларусі з краінамі Еўропы ў 1985–1991 гг. паказвае, што, нягледзячы на новыя магчымасці і значныя поспехі ў гэтай сферы, культура краіны па-ранейшаму ўспрымалася ў свеце не як культура самабытнага народа Еўропы, а як поспехі асобных людзей.

Невыразнасць вобраза беларускай нацыі ў свеце стала наступствам шэрага аб'ектыўных і суб'ектыўных фактараў як матэрыяльнага, так і духоўнага плана. Адна з галоўных прычын гэтага – ідэалагічнае кіраванне СССР, якое прывяло да сцірання нацыянальных асаблівасцей, дэфармацыі свядомасці беларусаў і русіфікацыі.

Вышэйвыкладзенае дазваляе зрабіць наступныя вывады. Па-першае, выразна выяўляецца аднабаковасць музейных праектаў, іх у асноўным мастацкі і этнаграфічны кірункі. Нераспрацаванасць тэматыкі выставак прыводзіла да таго, што БССР вывозіла за мяжу толькі творы сучасных мастакоў ідэалагічнага зместу, і гэта не садзейнічала фарміраванню адэкватнага ўражання аб нашай краіне. Прыналежнасць Беларусі да СССР увогуле не давала ёй магчымасці быць самастойнай у выбары тэматыкі. Па-другое, "імпарт" музейных выставак значна пераўзыходзіў іх "экспарт". У асноўным супрацоўніцтва адбывалася з краінамі СССР і з сацыялістычнымі краінамі, што замінала паўнавартаснаму развіццю музейных міжнародных кантактаў. Аднак былі і адзінкавыя

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

выпадкі супрацоўніцтва з краінамі Заходняй Еўропы. Па-трэцяе, форма ўдзелу ў міжнародным супрацоўніцтве па сутнасці была аднастайнай. Гэта ў асноўным дні культуры, у рамках якіх разам з выступленнямі музычных калектываў дэманстраваліся творы мастацтва. Што да музеяў, то найбольш наведваемымі замежнымі дэлегацыямі былі Дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і Дом-музей Першага з’езда РСДРП. Вельмі папулярнымі былі мемарыяльныя комплексы “Хатынь”, Курган Славы, Брэсцкая крэпасць і інш. Такая спецыфіка абумоўлівала змест і кірункі міжнароднага музейнага супрацоўніцтва, у выніку чаго на міжнароднай арэне Беларусь асацыіравалася амаль толькі з савецкім перыядам, партызанскім рухам і перамогай у Вялікай Айчыннай вайне. Яшчэ трэба дадаць, што практычна толькі адзін музей удзельнічаў у міжнародным супрацоўніцтве з краінамі Еўропы і тым самым дапамагаў пашырэнню ведаў аб БССР як асобнай краіне. Гэта Дзяржаўны мастацкі музей БССР.

---

*1. Архіў* Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь. Фонд 164. – Воп. 1. – Спр. 595.

*2. Беларускае* слова на берагах Ядрана [Дні Беларусі ў Славеніі] // Літаратура і мастацтва. – 1986. – 17 кастр. – С. 2.

*3. Отчёт* о проделанной работе в период с 1986 г. по 1992 г.: текущий архив Белорусского общества дружбы и культурной связи с зарубежными странами. – 14 с.

*4. Сообщения* Государственного художественного музея БССР. – Мн.: Навука і тэхніка, 1994. – Вып. 1. – 400 с.

*5. Шадурский, В.* Культурные связи Беларуси со странами Центральной и Западной Европы (1945-й–1990-е гг.) / В.Шадурский. – Мн.: БГУ, 2000. – 285 с.

*6. Шадурский, В.* Развитие культурных связей Беларуси со странами Центральной и Западной Европы (1985–1991 гг.) / В.Шадурский // Белорусский журнал международного права и международных отношений. – 1999. – № 1. – С. 65–76.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ